

# САЎЧЫК Баляслаў Юльянавіч

У дакументах Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі г.Масквы (архіўная даведка ад 09.06.2000 №С-10634) у спісках грамадзян, якія былі прымусова пагнаны з вёскі Самаравічы Падбалоцкага сельскага Савета Зэльвенскага раёна ў нямецкую няволю, значыцца Саўчык Б.Ю.

Нарадзіўся Баляслаў Юльянавіч у вёсцы Самаравічы ў мнагадзетнай сям'і. Рана страціў бацьку. Каб дапамагчы маці падымаць братоў і сясцёр (у сям'і было сямёра дзяцей), яму з ранняга дзяцінства прыйшлося працаваць: быў у заробках у Лаўрах, Дуброўніках, Савічах, Зэльве…

У 1943 годзе ў маі месяцы маці прыйшла ў вёску Хоражава і сказала, што хочуць забраць на работы ў Германію старэйшага сына Станіслава. Яна сама не здолее працаваць на зямлі, паколькі муж памёр, а ў сям'і дзеці. Баляслаў быў малодшы за брата, таму маці вырашыла адпраціць у Германію яго.

Шмат выпрабаванняў давялося зведаць шаснаццацігадоваму юнаку на чужыне: спачатку пасвіў кароў, затым працаваў на лесанарыхтоўках, батрачыў на ферме, капаў акопы.

Баляслаў Юльянавіч успамінаў:

- У Ваўкавыск на вакзал прыйшоў таварны цягнік. Нас было многа, каля трох вагонаў. Прывезлі ў раён горада Гейдэнкрук. Папрыязджалі баўэры, усіх пабралі, а мяне не. Сказалі, што малы і пагэтаму буду пасвіць кароў.

З мая па кастрычнік 1943 года парабкаваў на гаспадара Отта Меццэль у вёсцы Гальздон Енэйтэн. Вясною пасвіў 100 кароў каля Нёмана, затым забралі ў лес, пасля зноў да гаспадара.

З лістапада 1943 года па май 1944 года працаваў на лесапавале ў раёне станцыі Екштэркен, Тыльзіт (паштовае аддзяленне Пагеген).

З мая па верасень 1944 года батрачыў на ферме ў гаспадара Давіда Гібіша (паштовае аддяленне Медэвальд, вёска Каволін, раён Гейдэнкрук).

У верасні 1944 года быў эвакуіраваны разам з гаспадаром за Нёман, капаў акопы 8 тыдняў на Літве для нямецкай арміі. Месца называлася Валкавіскі. Пасля паехаў зноў да гаспадара і там працаваў да восені. Пасля была эвакуацыя. Ездзіў 120 кіламетраў на ровары пад Кенінсберг і назад: гналі гэтых кароў да гаспадара. У 1945 годзе ганялі на розныя работы.

Гаспадыня раней паехала ў Германію, а гаспадара забралі ў армію. Нас далучылі да франтавой паласы, каб дапамагалі немцам. Калі пачалі наступаць нашы, савецкія воіны, немцы прапанавалі ехаць з імі. Дзесяць чалавек паехалі ў Германію, а дзесяць засталіся.

У г. Тыльзіт прайшлі рэгістрацыю і павезлі пад Кенінсберг. Рабілі аэрадром. Хадзілі на вакзал, але цягніка не было, таму са зборнага пункта

Мільюнін вырашылі пяшком ісці ў Беласток. Адтуль у Ваўкавыск прыехалі на таварным цягніку. Па дарозе адмарозіў вушы. Дамоў дабіраўся пяшком, пакуль нейкі чалавек не падвёз на возе.

Пасля вызвалення разам з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі Баляслаў быў адпраўлены на будаўніцтва аэрадрома пад Калініградам. Пасляваенны час быў таксама вельмі няпростым: хлопцу даводзілася шмат працаваць на ўласнай гаспадарцы, дапамагаць маці, братам і сёстрам.

Ажаніўся на Ганне Дамянікаўне, дзяўчыне, лёс якой быў падобным на лёс Баляслава. Праз год, калі ў сям'і нарадзіўся старэйшы з траіх дзяцей, -- сын Станіслаў, Баляслава забралі ў армію на тры з паловай гады.

Пасля службы ў арміі Саўчык Б.Ю. апрацаваў у калгасе "Прагрэс" млынаром. Выйшаўшы на заслужаны адпачынак, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Дапамагаў гадаваць унукаў і праўнукаў.

Памёр. Пахаваны на могілках в.Крамяніца.